# ГІСТОРЫКІ СВЯТКУЮЦЬ 30-ГОДДЗЕ

## СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙ

16 мая 1934 года Саўнарком СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову аб выкладанні грамадзянскай гісторыі ў школах СССР. Гэтае рашэнне адыграла важную ролю ў развіцці адукацыі і гістарычнай навукі ў краіне. Яно паслужыла асновай для аднаўлення і адкрыцця новых гістарычных факультэтаў ва ўніверсітэтах і педагагічных інстытутах. Тады і быў створаны гістарычны факультэт у нашым універсітэце. Ён пачаў сваю работу 1 верасня 1934 года.

За трыццаць гадоў гістарычны факультэт падрыхтаваў каля 1750 высокакваліфікаваных спецыялістаў — гісторыкаў, якія паспяхова працуюць у галіне народнай гаспадаркі, культуры і асветы. Многія з іх узначальваюць тэхнікумы, школы, органы народнай асветы. Атрыманыя ў БДУ веды яны аддаюць моладзі.

Вялікі ўклад унёс факультэт і ў справу падрыхтоўкі кандыдатаў і дактароў навук. За апошнія гады каля ста выпускнікоў факультэта абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі і паспяхова працуюць загадчыкамі кафедраў, дацэнтамі, прафесарамі і старшымі навуковымі работнікамі ў ВНУ і навукова-даследчых установах. На факультэце вялі вялікую вучэбную і навуковую работу буйныя вучоныя-гісторыкі — акадэмікі М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, Т. С. Гарбуноў, член-карэспандэнт АН БССР Н. В. Каменская, прафесары А. А. Савіч, В. Н. Кун, Г. В. Яфімаў.

Студэнты і выкладчыкі факультэта разам з усім савецкім народам актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у партызанскіх атрадах і на працоўным фронце. Многія з іх аддалі сваё жыццё за гонар і незалежнасць нашай Радзімы. Сярод іх — дацэнты Логмель, Махнач, студэнты Рыбакоў, Бабчынскі, Налівайка і іншыя.

Цяпер на чатырох кафедрах факультэта працуюць 5 прафесараў, 15 дацэнтаў і 10 выкладчыкаў. Большасць з іх — выхаванцы факультэта.

Вучэбна-выхаваўчая работа на факультэце вядзецца ў адпаведнасці з законам аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі. Студэнты факультэта з першых крокаў свайго жыцця ва ўніверсітэце рыхтуюцца да ганаровай і адказнай работы — настаўніка сярэдняй школы. На лекцыях, практычных занятках, ва ўпартай самастойнай рабоце над літаратурай і крыніцамі ў кабінетах, чытальных залах і бібліятэках, у даследніцкай рабоце ў архівах, музеях і рукапісных фондах, у археалагічных і этнаграфічных экспедыцыях будучыя гісторыкі набываюць трывалыя тэарэтычныя веды і навыкі даследніцкай работы, а ў час педагагічнай і стажорскай практык у школах і практыкі ў піянерскіх лагерах вучацца педагагічнаму майстэрству.

Студэнты факультэта жывуць паўнакроўным, змястоўным жыццём: разгортваюць палітмасавую работу на прадпрыемствах горада, у калгасах і саўгасах рэспублікі, актыўна ўдзельнічаюць у навуковых канферэнцыях. Яны ўстанавілі трывалыя сувязі са студэнтамі Вільнюскага, Ленінградскага, Маскоўскага, Кіеўскага і іншых універсітэтаў, выязджаюць туды з навуковымі дакладамі, прымаюць гасцей з гэтых універсітэтаў.

Прафесары і выкладчыкі факультэта, кіруючыся гістарычнымі рашэннямі XXII з'езда КПСС, прыкладаюць усе намаганні, каб узняць на новы, больш высокі ўзровень вучэбную, выхаваўчую і навуковую работу на факультэце.

За апошнія гады значна павялічылася выданне навуковых прац. Толькі летась прафесары і выкладчыкі апублікавалі навуковыя працы аб'ёмам звыш 100 друкаваных аркушаў.

На факультэце вядзецца вялікая работа па павышэнню навуковай кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу. За апошні час на факультэце абаронены дзве доктарскія дысертацыі (Г. М. Ліўшыц і Л. М. Шнеерсон), падрыхтаваны і здадзены на абарону чатыры доктарскія дысертацыі (І. М. Ігнаценка, Ф. М. Няхай, Г. М. Трухноў і Л. С. Абецадарскі), абаронены тры і падрыхтаваны і здадзены на абарону пяць кандыдацкіх дысертацый.

Кафедры факультэта аказваюць дапамогу школам рэспублікі ў паляпшэнні выкладання гісторыі. Дацэнты Л. С. Абецадарскі, М. П. Баранава і Н. Г. Паўлава напісалі падручнік па гісторыі БССР для сярэдняй школы; дацэнты М. П. Баранава і Н. Г. Паўлава з'яўляюцца аўтарамі вучэбнага дапаможніка па гісторыі БССР для 8-гадовай школы; навуковыя работнікі факультэта сістэматычна публікуюць у часопісах і газетах артыкулы ў дапамогу настаўнікам, выдаюць метадычныя дапаможнікі па гісторыі, чытаюць лекцыі для настаўнікаў школ Мінска і рэспублікі. А наперадзе яшчэ больш велічныя задачы, якія выцякаюць з Праграмы КПСС. Няма сумнення, што згуртаваны і працалюбівы калектыў гістарычнага факультэта з гонарам выканае іх.

**Дацэнт П. З. САВАЧКІН,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**

## *Віншуем, Аляксей Савіч!*



*Гэтымі днямі дацэнту гістфака Аляксею Савічу Сідарэнку споўнілася 50 гадоў.*

*Як і многія спецыялісты-гісторыкі, ён вырас у нашым універсітэце, куды паступіў вучыцца ў 1937 годзе. Вайна перапыніла вучобу, і Аляксей Савіч накіраваўся на фронт. Аб яго баявых справах сведчаць чатыры ўрадавых узнагароды: два ордэны і два медаля.*

*Увесь час, які прайшоў пасля заканчэння гістфака, Аляксей Савіч займаецца навукова-даследчай работай. Яго ўвагу прыцягвае гісторыя роднай рэспублікі. Класавай барацьбе ў аднаўленчы перыяд ён прысвяціў работы «Першая праднялогавая кампанія ў БССР» «Першыя крокі сацыялістычнага будаўніцтва ў Беларусі пасля грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі» і інш. Акрамя таго, А. С. Сідарэнка працуе над тэмай «Прафсаюзы Беларусі ў барацьбе за сацыялістычную індустрыялізацыю рэспублікі». Вынікі гэтай працы ён абагульніў у падрыхтаванай да друку манаграфіі з такой жа назвай.*

*Грамадскасць гістфака ведае А. С. Сідарэнку як чулага, душэўнага чалавека, глыбокага даследніка важных гістарычных працэсаў і жадае яму новых поспехаў.*

## *На Сходні*

Я ўспамінаю 1943 год. Саратаўская вёска. Дзесьці там, за лініяй фронту, родная Беларусь. А я выкладаю гісторыю ў сярэдняй школе. Школа, вучні, паведамленні з фронту... Гэтым і жыла, як і многія нашы студэнты, што паспелі скончыць да вайны чатыры курсы гістфака БДУ.

І раптам — паведамленне ў «Правде» аб аднаўленні БДУ; гэтай падзеі прысвячае артыкул «Учительская газета».

Станцыя Сходня? Дзе гэта? Як усё будзе? А студэнты, выкладчыкі? Пісьмо ад Машы Арцюкевіч, дырэктара школы на Урале, рассейвае сумненні. Едзем! Едзем заканчваць гістфак. Гэта трэба перажыць, каб адчуць усю радасць такой падзеі.

І вось Масква. Сходня. Маляўнічае месца Падмаскоўя. БДУ размясціўся ў будынку школы. Збіраюцца студэнты, выкладчыкі. Хвалюючыя сустрэчы, слёзы радасці і ад перажытага. Пяцікурснікаў сабралося сем чалавек—сем дзяўчат. Амаль дзявочым быў і ўвесь гістфак. Яно і зразумела — вайна.

Не забудзецца ні першы званок, ні першая лекцыя ў 1943 годзе. Няхай класныя пакоі толькі ўмоўна можна назваць аўдыторыямі, няхай не хапае абсталявання. Галоўнае, вучымся, зноў слухаем лекцыі У. М. Перцава, Л. М. Шнеерсона, У. І. Шаучэнкі. Шмат чытаем, амаль увесь час праводзім у бібліятэках імя Леніна і гістарычнай. Маем магчымасць слухаць маскоўскіх прафесараў А. А. Савіча, І. І. Палосіна, У. К. Нікольскага, К. В. Сіўкова. Сустракаемся з акадэмікамі М. М. Нікольскім, А. М. Панкратавай, У. І. Пічэтам. Частка студэнтаў слухала некаторыя лекцыі ў МДУ.

Дружнай сямёркай называлі наш курс. Разам на лекцыях, у бібліятэцы, у кіно. Жылі камунай. У сумеснай вучобе, працы (колькі лесу нарыхтавалі студэнты!) загартавалася наша таварыскасць, наша дружба. І гэта пачуццё мы пранеслі праз гады і захавалі яго.

...Выпускны баль ваеннага часу. Атрыманы прызначэнні. Пачынаецца новы этап нашага жыцця. Разбураная і параненая Беларусь чакала нас, і мы з радасцю рыхтаваліся аддаць ёй свае сілы і веды.

**В. МАСКАЛЕНКА,**
**намеснік рэдактара часопіса «Народная асвета».**

## Мы апраўдалі давер'е

З пункту гледжання гісторыі 30 гадоў — невялікі тэрмін. Але калі я даведалася, колькі зрабіў наш гістфак за гэты час, то яшчэ больш прасякнулася павагай да тых, хто даваў пуцёўкі ў жыццё маладым.

Мы з удзячнасцю ўспамінаем нашых выкладчыкаў, клапатлівых настаўнікаў-выхавацеляў Ф. М. Нячая, Л. М. Шнеерсона, Л. С. Абецадарскага, П. З. Савачкіна, М. В. Фрыдман. Трывалыя веды яны нам далі. Памятаю, ужо на першым курсе перад намі шырока адчынілі дзверы ў навукова-даследчыя гурткі, у музеі. Мы навучыліся знаходзіць каштоўны матэрыял, правільна аналізаваць і абагульняць яго, ацэньваць гістарычныя падзеі. І як гэта цяпер дапамагае ў рабоце!

Улетку 1954 года мы развіталіся з факультэтам. А зараз ужо многія юнакі і дзяўчаты з гонарам гавораць, што займаліся ў гісторыкаў Т. В. Сматрэнка, Ф. Я. Чарной, Л. С. Касянюк і іншых маіх былых аднакурснікаў.

Не, не падвялі мы вас, дарагія выкладчыкі. Праўда, часам было цяжкавата, не хапала метадычных навыкаў, практыкі. Відаць, на факультэце ўлічылі гэты недахоп. Але як мы былі ўдзячныя Фактаровічу і Элентух, якія чыталі спецкурсы па літаратуры і мастацтву!

Са святам, таварышы гісторыкі! Новых вам поспехаў!

**Н. Е. ГЕРМАН.**
**выкладчыца школы № 60 г. Мінска.**

## 6000 МАНЕТ— ПАДАРУНАК ФАКУЛЬТЭТУ

*Штогод на тэрыторыі Беларусі адкрываюцца скарбы. Першым сярод тых, хто вывучае іх, з'яўляецца выдатны нумізмат Валянцін Навумавіч Рабцэвіч. Любоў да збору рэдкасных манет узнікла ў яго яшчэ ў дзяцінстве. А потым яна перарасла ў вялікае, сур'ёзнае захапленне. За 23 гады Валянцін Навумавіч сабраў больш як 6 тысяч манет. У яго калекцыі прадстаўлены манеты, пачынаючы з V ст. да н. э. і канчаючы XVII ст. н. э. Большасць з іх была ў абарачэнні на тэрыторыі нашай рэспублікі і сярод іх—манеты Аляксандра Македонскага, Старажытнай Грэцыі і Рыма. Арабскага Халіфата і інш.*

*У 1963 годзе В. Н. Рабцэвіч падараваў сваю калекцыю гістарычнаму музею БДУ. А ў гэтыя дні адбылася знамянальная падзея — на гістфаку адкрыўся нумізматычны кабінет, які з'яўляецца адзіным у ВНУ краіны.*

Я. БАРАНОЎСКІ,
студэнт 3 курса гістфака.



*Гэты здымак ужо з гісторыі факультэта. На ім вы бачыце групу выкладчыкаў і студэнтаў у час святкавання 25-годдзя гістфака.*



Вялікі аўтарытэт сярод таварышаў у пяцікурсніка гістфака **Анатоля Ягорава.** Ён паспяхова вучыцца і актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. Працуючы з архіўнымі крыніцамі Мінска, Гродна, Ленінграда, Анатоль заўсёды ўмеў знаходзіць важнае, галоўнае, што дапамагала яму рабіць грунтоўныя, навукова абгрунтаваныя вывады. Акрамя таго, Ягораў — адзін з ветэранаў універсітэцкай і факультэцкай зборных па баскетболу.

**Яўген Асіпкоў** святкаваў гэтымі днямі радасную падзею ў сваім жыцці: партсход факультэта прыняў яго кандыдатам у члены партыі. Высокае давер'е юнак заслужыў выдатнай вучобай, актыўным удзелам у грамадскім жыцці ўніверсітэта.

**На здымку, А. Ягораў і Я. Асіпкоў.**

## Так трымаць, красмены!

Спартыўнае жыццё на гістфаку слаўнае сваімі традыцыямі. Так ужо вядзецца, што кожны калектыў мае свой самы любімы, самы паважаны від спорту — прадмет гонару калектыву. Такім відам спорту на нашым факультэце з'яўляецца «каралева спорту» — лёгкая атлетыка, асабліва найбольш масавы і цікавы від яе — крос.

Штогод вясною і ўвосень БДУ праводзіць традыцыйныя кросы. Больш як дзесяць гадоў запар гістфак выйграе першыя месцы ў кросе. І гэта не выпадкова: партбюро, камсамольская арганізацыя, прафсаюзная, выкладчыцкі састаў удзяляюць шмат увагі кросу. Прыемна выходзіць на старт і бачыць, колькі таварышаў «хварэе» за цябе. Гэта і сілы надае.

Хутка, у красавіку, адбудзецца фінал вясновага кросу, прысвечанага 52-й гадавіне «Праўды». Хочацца верыць, што красмены гістфака і на гэты раз не падвядуць родны факультэт.

**Аспірант М. БАЗЫЛЕЎ.**

*Старонку падрыхтаваў да друку наш калектыўны карэспандэнт — рэдкалегія насценгазеты «Историк»*


**Рэдактар М. ІОСЬКА.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03552. Тыр. 2000. Зак. 1298.